# РЭФЕРАТ


Справаздача 48 с., 1 кн., 47 крын.

АФАРЫЗМ, СЕМАНТЫКА, ПРАГМАТЫКА, МАЎЛЕНЧА-КАМУНІКАЦЫЙНАЯ АДЗІНКА, ЖАНР, МОЎНАЯ АСОБА АФАРЫСТА, АФАРЫСТЫЧНЫ ДЫСКУРС

Аб’ект вывучэння – семантычныя і прагматычныя асаблівасці беларускай афарыстыкі.

Прадметам даследавання з’явіліся беларускія афарыстычныя выслоўі, іх семантыка-прагматычнае апісанне і сістэматызацыя.

Метады даследавання: лінгвістычнае назіранне і абагульненне, стылістычны разбор, элементы семантычнага і супастаўляльна-параўнальнага аналізу.

Характарыстыка працы: вызначана, што тэкставыя беларускія афарызмы павінны разглядацца ў філалагічным плане як адзін з відаў слоўнай творчасці, што ў сваёй сукупнасці ўваходзяць у лік устойлівых утварэнняў – побач з іншымі выслоўямі (максімамі, сентэнцыямі, прыказкамі, прыгаворкамі, заклікамі і інш.) і мікратэкстамі (устойлівымі дыялогамі, анекдотамі, развітаннямі, загадкамі, замовамі, інвектывамі, праклёнамі, пародыямі, прыпеўкамі і пад.) – і складаюць істотную частку нацыянальнай моўнай ідыяматыкі. Даследаванне афарызмаў у аспекце іх семантыка-прагматычнай спецыфікі дасць магчымасць раскрыць іх лінгвістычную сутнасць, што з’яўляецца зыходным пунктам у іх цэласным філалагічным апісанні, і паглыбіць уяўленне аб ідыяматыцы беларускай мовы.

Ступень укаранення: вынікі даследавання укаранены ў адукацыйны працэс вну, што пацверджана аб’ёмам публікацый (37) як асобай формы ўкаранення вынікаў.

Галіна прымянення: школы, вну, інстытуты развіцця адукацыі.

Навуковая і практычная значнасць. Атрыманыя вынікі НДП «Семантыка і прагматыка беларускай афарыстыкі» з’яўляюцца новымі. Упершыню праведзена тэарэтычнае апісанне семантычных і прагматычных асаблівасцяў беларускага афарызма. Вылучана прапанова аб даследаванні беларускай афарыстыкі метадамі лінгвастылістыкі, што звязана з такімі якасцямі афарызмаў, як шырокае выкарыстанне ў іх тропаў і фігур, а таксама, што афарызм не толькі належыць да малых жанраў літаратуры і ўзбагачае нацыянальную моўную ідыяматыку, але і з’яўляецца пэўнай устойлівай адзінкай са складанай унутранай структурай.